# Адчуць чароўную аўру Алены Кіш

**Мастацкая галерэя «Універсітэт культуры» стала цэнтрам правядзення выставы, прысвечанай памяці выдатнай беларускай мастачкі Алены Кіш, якая стварылася па выніках пленэру «З Аленай Кіш у сэрцы»**




*Арыіналы Алены Кіш захапляюць сваёй энергетыкай*

Гэтая падзея адбылася пад патранажам Міністэрства культуры, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту культуры і мастацтваў, Гісторыка-культурнага музею-запаведніку «Заслаўе», мастацкіх галерэй «Дом карцін», «Мастацкі маёнтак», установе «Цэнтр экалагічных рашэнняў».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




*Алена Кіш. Дзева на водах*

Як падкрэсліў на адкрыцці выставы «З Аленай Кіш у сэрцы» прафесар, прарэктар па навуковай рабоце БДУКМ Віктар Языковіч, што традыцыйнае мастацтва, традыцыйныя каштоўнасці і светаўспрыманне, якія выяўляюць творы Алены Кіш — гэта тыя кропкі адліку, з якіх пачынаецца адукацыйны і навуковы працэс у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*У райскім садзе Алены Кіш*

Мастацкі напрамак у якім працавала Алена Кіш называюць наіўным, — заўважыў Языковіч, — але гэта не зусім так, бо яе мастацтва — глыбокае і сімвалічнае. І ў гэтым спалучэнні наіўнасці і глыбіні мы, сучаснікі бачым каштоўнасць твораў геніяльнай народнай мастачкі.

РЕПОЗИТОРИЙ



*Выстава выклікала вялікую цікавасць публікі*

Арганізатары выставы выказалі мастакам шчырую ўдзячнасць за тое, што залы ўпрыгожылі не толькі іх творы, якія былі створаны ўдзельнікамі згуртавання «Мастацкі маёнтак» — Ганнай Балаш, Аляксандрам Дземідавым, Аляксандрам Рэпкам, Аляксандрам Наўгародцавым. Але і за тое, што наведвальнікі змаглі пазнаёміцца, адчуць чароўную аўру арыгіналаў маляванак Алены Кіш.

РЕПОЗИТОР



*Хатка для Алены. Ганна Балаш*

На выставу іх прадставілі супрацоўнікі гісторыка-культурнага музею-запаведніка «Заслаўе», а таксама прыватныя калекцыянеры. Сярод гэтых шэдэўраў аматары беларускага

мастацтва змаглі ўбачыць такія маляванкі, як «Рай», «Дзева на водах», «У райскім садзе», «Ліст да каханага» і іншыя шэдэўры мастачкі.

З вынікамі двухтыднёвага пленэру ў вёсцы Дубравы Лагойскага раёну можна было пазнаёміцца ў іншых залах галерэі «Універсітэт культуры». Наведвальнікаў цікавіла тое, як чароўны свет Алены Кіш адлюстроўваўся ва ўяўленні сучасных мастакоў. Трэба адзначыць, што жывапісныя творы ўсіх удзельнікаў «Мастацкага маёнтка» у рознай ступені адчуў уплыў творчасці Алены Кіш.




*Ганна Балаш. Дыванок*

Але, безумоўна, пераканаўчымі ўзорамі пераасэнсавання творчай манеры і лёсу мастачкі, можна было адзначыць палотны Ганны Балаш («Домік для Алены», «Алена Кіш прыйшла на худ.савет»), Аляксандра Дземідава («Музыка для Алены», «Прысвячэнне Алене»). Але і іншыя мастакі, — удзельнікі мастацкага пленэру «З Аленай Кіш у сэрцы», — прадэманстравалі сваё паважлівае стаўленне да спадчыны геніяльнай і трагічнай мастачкі, якой давялося жыць і ствараць свае палотны-маляванкі ў цяжкі міжваенны перыяд.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




*Аляксандр Дземідаў. Музыка для Алены*

Вядомы беларускі мастацтвазнаўца, арт-крытык Ларыса Фінкельштэйн адзначыла: «Творчасць Алены Кіш — невычарпальная крыніца для натхнення сучасных мастакоў. Яе творчасць і лёс недастаткова вывучаны, недастаткова зразумелая сучаснаму мастаку, крытыку ці аматару выяўленчага мастацтва. Яе творы можна глядзець і зноў углядацца, знаходзячы новыя рысы вобразаў, сімвалаў і плыняў. Да вобразаў-маляванак Алены Кіш звярталіся шмат хто з беларускіх мастакоў, для якіх яе творчасць — крыніца натхнення, асоба, якая прываблівае мастакоў, як манок

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Абмеркаванне ўбачанага*

Алена Кіш, — адзначыла Фінкельштэйн, — стварыла свой фантастычны сусвет, але не местачковы, а больш глабальны, сусветны Я б назвала як мастачкай без межаў. Гэта рыса Алены Кіш вабіла жывапісцаў, якія працавалі паўстагоддзя таму, вабіць творцаў і сёння і, думаю, у будучыні асоба Алены Кіш, яе творчасць і трагічны лёс будзе цікавы будучым мастакам, якім яшчэ трэба будзе навучыцца «счытваць» сімвалы і алегорыі мастачкі. Наперадзе больш глыбокае асэнсаванне агульных рысаў пластычнай мовы, прастары і часу.Бо ў творчасці А.Кіш ёсць разважанне пра час, прастору, колер, але яны патрабуюць унутранага, што ідзе ад сэрца, адчування свету Алены Кіш.

РЕПОЗИТОРИЙ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ